


# Гродзенскі УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА УСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ «ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ»

Выдаецца з 1986 года ● № 3 (286) ● 4 красавіка 2001 года, серада

Выходзіць адзін раз на месяц ● Распаўсюджваецца бясплатна


## НОВЫЙ ГУБЕРНАТОР ГРОДНЕНЩИНЫ

В Гродно состоялась 9-я сессия областного Совета депутатов 23-го созыва, в повестке которой значился только один вопрос - «Об утверждении в должности председателя областного исполнительного комитета».

4 февраля безвременно ушел из жизни авторитетнейший на Гродненщине человек - Александр Дубко. Прежде чем приступить к работе, депутаты почтили минутой молчания его память.

Президент Александр Лукашенко не только назвал кандидатуру нового губернатора, но и лично принял участие в работе сессии. Он не скрывал, что председателю облисполкома передается благодатный уголок земли, на котором живут добрые и трудолюбивые люди.

Президент предложил избрать губернатором Владимира Егоровича Савченко, который приехал в область в июле 1999 года и все это время работал первым заместителем председателя Гродненского облисполкома, а в последние два месяца исполнял обязанности председателя. Президент и выступавшие в прениях депутаты сошлись во мнении, что опыт работы, приобретенный Владимиром Савченко в те времена, когда он руководил колхозом, Круглянским райисполкомом, работал заместителем председателя Могилевского облисполкома и уже здесь, на Гродненщине, показал высокие деловые качества кандидата на пост губернатора и его ответственность.

**«Рэспубліка».**

## З ДНЁМ НАРАДЖЭННЯ, УНІВЕРСІТЭТ!



16 сакавіка калектыў універсітэта ўрачыста адзначыў свае імяніны. Сёлетняя гадавіна - 61-я. Ёй былі прысвечаны святочныя мерапрыемствы: віншаванне рэктара прафесара С.А.Маскевіча, віншаванні сваёй Alma mater факультэтаў, а таксама прэс-канферэнцыя кіраўніцтва універсітэта для студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў. Цікавай была сустрэча зборных каманд студэнтаў і супрацоўнікаў у КВЗ.



*ЗАМЕЖНЫЯ СУВЯЗІ*

## ПАДПІСАНЫ ДАГАВОР

Установа адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы» актыўна супрацоўнічае з замежнымі установамі адукацыі: універсітэтамі Польшчы, Расіі, ЗША, Латвіі і г.д. Нядаўна падпісалі дагавор з яшчэ адным партнёрам - Акадэміяй Падляскай (Седльцэ, РП).

Варта заўважыць, што задоўга да гэтага супрацоўніцтва паміж дзвюма ВНУ было даволі інтэнсіўным, і дагавор толькі ўзаконіў гэтыя партнёрскія

(*Заканчэнне на 2-й стар.*).

## НА САВЕЦЕ

універсітэта абмеркавана пытанне «Аб выніках работы універсітэта ў 2000 годзе і задачах на 2001 - 2005 гады». З дакладам выступіў рэктар універсітэта прафесар С.А. Маскевіч.

Матэрыялы чытайце на 4-6 старонках сённяшняга нумара газеты.

## ВІНШАВАЛЬНАЯ ПАШТОЎКА

**Рэктарат, прафком, савет ветэранаў віншуюць з юбілеем і жадаюць моцнага здароўя, шчасця, дабрабыту, поспехаў юбілярам. Нагадваем, калі і каго можна павіншаваць.**

※ 2 красавіка - **Наталлю Георгіеўну ЦАР** - дацэнта кафедры спартыўнай медыцыны і лячэбнай фізкультуры.

※ 4 красавіка - **Наталлю Сяргееўну МАКАРАВУ** - лабаранта кафедры анатоміі і фізіялогіі.

※ 10 красавіка - **Чэславу Іосіфаўну ІСТОМІНУ** - старшага выкладчыка кафедры раманскіх моў.

※ 18 красавіка - **Наталлю Васільеўну ПАЎЛОВІЧ** - намесніка дэкана факультэта біялогіі і экалогіі.

※ 18 красавіка - **Аляксандру Іосіфаўну ВЕЖАЛЬ** - прыбіральшчыцу інтэрната № 2.

※ 21 красавіка - **Ларысу Іванаўну ЛІМАР** - вядучага бібліятэкара.

※ 24 красавіка - **Ірыну Васільеўну ШЧУКІНУ** - галоўнага інжынера аддзела капітальнага будаўніцтва і рэканструкцыі адміністрацыйна-гаспадарчай часткі.

※ 26 красавіка - **Уладзіміра Андрэевіча ХІЛЮТУ** - старшыню прафкома супрацоўнікаў.

※ 30 красавіка - **Святлану Міхайлаўну ХМАРУ** - метадыста 1 катэгорыі факультэта эканомікі і кіравання.

## ЦИТАТА НОМЕРА:

**«Назначение человека - в разумной деятельности». Аристотель.**

## НОВОСТИ

### МЕНЯЕТСЯ СТИЛЬ РАБОТЫ

Стали традиционными отчеты руководителей структурных подразделений. На последних заседаниях ректората о совершенствовании управления размышляли начальник издательского отдела Е.С.Барталевич, начальник отдела зарубежных связей Ю.А.Войтукевич, начальник планово-экономического отдела Г.В.Бородавко, главный бухгалтер Т.Н.Завадская, начальник Вычислительного центра Н.К. Харук, начальник учебного отдела П.Л. Новицкий. Ректорат положительно оценивает такую форму работы.

### ВУЗОВСКАЯ НАУКА: НОВЫЙ ЭТАП РАЗВИТИЯ

Издан приказ ректора «Об активизации научно-инновационной деятельности университета» за №115 от 14. 03. 2001. Он направлен на совершенствование системы управления научной деятельностью, активизацию работы НИСа по генерации внебюджетных доходов за счет научных исследований. Авторы проекта реорганизации научно-исследовательского сектора выражают надежду, что это позволит развивать прикладные научные исследования, направленные на решение проблем региона и республики, создать механизм, обеспечивающий нацеленность научных коллективов и ученых на получение конечного продукта.

В соответствии с этим приказом с середины марта организационное сопровождение финансируемых госбюджетных НИР передается от НИСа научному отделу. Плановая служба НИСа переходит в состав ПЭО, а бухгалтерская служба - в состав бухгалтерии университета. Еще один важный момент в реорганизации структуры: в штатное расписание университета введена должность проректора по научной и инновационной работе.

*ЗАМЕЖНЫЯ СУВЯЗІ*

## ПАДПІСАНЫ ДАГАВОР

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).*

адносіны. Так, супрацоўнікі кафедры польскай філалогіі (загадчык С.П. Мусіенка) ездзілі ў трэцюю польскую школу польскай мовы і культуры (Седльцэ), а польскія студэнты Мірaслаў Якубяк і Дарота Козак з Акадэміі Падляскай у нашым універсітэце здавалі кандыдацкі мінімум, а потым і абаранялі дысертацыі на кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў пад кіраўніцтвам прафесара С.А. Мінюка.

На цырымонію падпісання дагавору прыбылі рэктар Акадэміі Падляскай Антоні Йоўка, прарэктар па навуковай рабоце АП Эдвард Паўлоўскі, генеральны консул Рэспублікі Польшча ў Гродне Сільвестр Шостак і дырэктар аддзела па ўзаемным прызнанні дыпломаў Міністэрства адукацыі РП Багуслаў Шыманьскі. Наш бок прадстаўлялі кіраўнікі універсітэта на чале з рэктарам прафесарам С.А.Маскевічам, кіраўнікі зацікаўленых падраздзяленняў.

Урачыста прайшла гэтая сустрэча калег.



- Сёння ў нас важная падзея, - сказаў рэктар С.А.Маскевіч. - Два гады прайшло, як прафесар Мусіенка перадала запрашэнне наведаць вашу Акадэмію. Дзякую, што вы прыехалі, і сёння ў нас ёсць магчымасць падпісаць дагавор аб супрацоўніцтве нашых навучальных установ. Ёсць тое, што дапаможа і вам, і нам. Спадзяюся, што сённяшні дзень стане пачаткам нашага супрацоўніцтва ў справе адукацыі і культуры.

Рэктар АП прафесар А.Йоўка сказаў:

- Любы асабісты кантакт лепш чым проста размова аб ім. Штосьці новае ўнесла гэтая сустрэча ў работу. Кожны прыезд нашых ці вашых выкладчыкаў нясе інфармацыю, і мы рады ведаць аб сваіх суседзях больш. Спадзяюся, што супрацоўніцтва будзе карысным.

- Спадзяюся, што гэты дагавор будзе для ўсіх важным, - сказаў консул РП у Гродне С.Шостак. - Некалькі месяцаў таму быў падпісаны дагавор аб супрацоўніцтве паміж гарадамі Ваўкавыск і Седльцэ. Ён прадугледжвае абмен школьнікамі, узаемную дапамогу.

І вось - урачысты момант падпісання дагавору, абмен падарункамі - кнігамі аб Беларусі і аб Польшчы.

Для гасцей былі арганізаваны экскурсіі па універсітэту, сустрэчы, прэзентацыі, культурная праграма.

**Людміла ДАНІЛАВА,**
**Людміла ВОЙДА (фота).**

## У БУДУЧЫНЮ - З НАДЗЕЯЙ І ВЕРАЙ

**Прафесар Сяргей ГАБРУСЕВІЧ: «Не можа быць культурным чалавек, не выхаваны ў традыцыях нацыянальнай культуры».**

17 студзеня 2001 года адбылося другое пасяджэнне семінара «Матэматычная адукацыя», якое праводзілася ў рамках праекта «У будучыню - з надзеяй і верай», прысвечанага сустрэчы трэцяга тысячагоддзя (гл. інфармацыю ў газеце «Гродзенскі універсітэт» № 12 (283) ад 29 снежня 2000 года і № 1 (284) ад 2001 года).

Перад слухачамі з розных факультэтаў універсітэта з паведамленнем на тэму «Аб развіцці нацыянальных культур у наступным тысячагоддзі» выступіў прафесар кафедры беларускай культуры С.А.Габрусевіч.

Спачатку С.А.Габрусевіч удакладніў тэрміналогію і ў агульных рысах апісаў інструментарый сучасных культуролагаў. Ён прааналізаваў розныя тлумачэнні паняццяў «культура», «народ», «этнас», «нацыя» і іншых, ахарактарызаваў розныя тыпы культур - сусветную, еўрапейскую, нацыянальную, масавую і г.д., выказаў думку, што галоўнае месца ў гэтым шэрагу належыць культуры нацыянальнай. Дакладчык адзначыў, у прыватнасці, што ён з'яўляецца прыхільнікам погляду, згодна з якім народ у большай ступені ёсць прадукт развіцця прыроды і ў значна меншай ступені - феномен сацыяльнай эвалюцыі.

Прафесар С.А.Габрусевіч з жалем канстатаваў, што працэс глабалізацыі сусветнай эканомікі, які сёння набірае моц, спрыяе дэградацыі нацыянальных культур - бясцэнных твораў шматвекавога вопыту чалавецтва. Ён звярнуў увагу прысутных на тое, што працэс канцэнтрацыі і цэнтралізацыі вытворчасці і капіталу ўступае ў супярэчнасць з беларускімі традыцыямі і не адпавядае менталітэту беларускага народа, а ігнараванне нацыянальных асаблівасцяў можа прывесці да негатыўных наступстваў для дзяржавы.

Выказваючы занепакоенасць з прычыны перспектыў развіцця беларускай культуры, прафесар С.А.Габрусевіч адзначыў, што яе захаванне і памнажэнне павінна стаць найважнейшай задачай, рашэнне якой будзе становіча ўздзейнічаць не толькі на духоўнае, але і на матэрыяльнае становішча грамадства. Неабходна, у прыватнасці, дзяржаўная падтрымка беларускай мовы, стварэнне ў рэспубліцы масавай нацыянальнай школы.

С.А.Габрусевіч глыбока аргументаваў свае высновы і прапановы, прыводзячы шматлікія прыклады і цытуючы вядомых вучоных і дзеячоў культуры. У заключэнне ён прапанаваў стварыць нядзельны лекторый, праз які выкладчыкі універсітэта маглі б садзейнічаць асвеце жыхароў горада Гродна.

Аўдыторыя з цеплынёю сустрэла выступленне С.А.Габрусевіча. На шматлікія пытанні, якія ўзніклі ў прысутных, былі дадзены разгорнутыя адказы.

**Ю.ЗАЛАТУХІН,**
**С.ЛЫТНЕЎ.**

# Аляксею Міхайлавічу ПЯТКЕВІЧУ - 70 гадоў

## СЛОВА ПРА НАСТАЎНІКА

**М.ПАЖАРЫЦКІ,**

**старшы выкладчык кафедры беларускай культуры**



Аляксей Міхайлавіч Пяткевіч... Сёння гэта паважаны прафесар, загадчык кафедры беларускай культуры Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы. А.Пяткевіч, як Авен па гараскопу, вельмі настойлівы і сумленны, што, здаецца, досыць характэрна для людзей, якія нарадзіліся пад гэтым знакам Задыяка. Настойлівасць Аляксея Міхайлавіча асабліва яскрава праявілася пры стварэнні кафедры беларускай культуры (першай кафедры такога тыпу ва ўсёй рэспубліцы). Каб дабіцца пастаўленай мэты, А.Пяткевіч неаднаразова пісаў у Міністэрства адукацыі, старанна абгрунтоўваючы сваю ідэю. І ў 1990 г. у Гродзенскім універсітэце кафедра беларускай культуры была створана. Праўда, спачатку яе часова ўзначальваў прафесар, доктар філалагічных навук Павел Уладзіміравіч Сцяцко. З 1991 г. і па цяперашні час кафедрай кіруе Аляксей Міхайлавіч. У 1968 — 1974 гг. ён, дарэчы, загадваў кафедрай беларускай літаратуры, на якой працаваў аж трыццаць тры гады.

Жывучы і працуючы ў Гродне з 1957 г., Аляксей Пяткевіч добра вывучыў гісторыю і культуру гэтага краю, стаў, па сутнасці, навуковым кансультантам краязнаўчых музеяў, іх аўтарытэтным дарадчыкам. Найбольш цесныя ж кантакты склаліся ў яго з Алесем Мікалаевічам Белакозам, стваральнікам Гудзевіцкага літаратурна-этнаграфічнага музея (Мастоўскі раён).

Выдадзены ў Мінску ў 1968 г. калектыўны зборнік гродзенскіх навукоўцаў-гуманітарыяў "Наднёманскія былі" пачынаецца вялікім артыкулам А.Пяткевіча "Сцежкамі роднага краю". У артыкуле, прадвесніку кнігі даследчыка **"Літаратурная Гродзеншчына"** (Мн., 1996), уважліва прасочваецца шлях прыгожага пісьменства рэгіёну са старажытных часоў і да пасляваеннай пары. На вялікі жаль, савецкая цэнзура выкасавала тады з нарыса А.Пяткевіча матэрыял пра Ларысу Геніюш. З ёй жа і многімі іншымі літаратарамі Гродзеншчыны (з Аляксеем Карпюком, Васілём Быкавым, Данутай Бічэль-Загнетавай) Аляксея Міхайлавіча звязваюць гады сяброўства.

А.Пяткевіч успрымаецца намі і як знаўца многіх сакрэтаў творчасці таго ж, скажам, Быкава. Ён неаднаразова аналізаваў аповесці празаіка на старонках абласной газеты, нядаўна ў часопісе "Полымя" (1998.- №10) надрукаваў грунтоўную рэцэнзію на зборнік "Сьцяна", а ў сваёй кнізе "Літаратурная Гродзеншчына" (с. 43–44) коратка і ў той жа час вельмі дакладна ахарактарызаваў творчасць пісьменніка гродзенскага перыяду, адзначыў быкаўскую *"глыбіню і маштабнасць мыслення, грамадзянска-гуманістычную ваяўнічасць пазіцыі..., здольнасць раскрываць на матэрыяле вайны амаральнасць таталітарнага рэжыму"*. У "Гродзенскай праўдзе" ад 20 лістапада 1965 г. А.Пяткевіч надрукаваў добры водгук на нашумелую тады аповесць В.Быкава "Мёртвым не баліць", у якой абвострана паказвалася праўда вайны, галавацяпства вышэйшага камандавання, дзейнасць смерша. Аўтар аповесці меў непрыемнасці з боку афіцыйнай улады. Выклікалі ў абкам і яго сябра А.Пяткевіча. Толькі дзякуючы тагачаснаму рэктару Гродзенскага педінстытута Дзмітрыю Спірыдонавічу Маркоўскаму Аляксей Міхайлавіч застаўся працаваць выкладчыкам. Падчас жыцця В.Быкава ў Гродне А.Пяткевіч арганізоўваў на філалагічным факультэце мясцовага педінстытута абмеркаванні кожнай новай аповесці празаіка. На дыскусіях прысутнічаў звычайна і сам аўтар. Ад А.Пяткевіча, дарэчы, мы ведаем пра змену загалоўка аповесці В.Быкава "Сотнікаў". У пісьменніцкім рукапісе яна, аказваецца, называлася "Двое ўначы". Сярод двух асноўных персанажаў (з пункту гледжання афіцыйных выхавальнікаў чытацкіх густаў) вылучыўся Сотнікаў, што ўрэшце і дало назву твору. Загаловак аповесці быў зменены без ведама аўтара.

Аднак звернем увагу на іншыя бакі шматграннай дзейнасці Аляксея Міхайлавіча Пяткевіча. Шаноўнаму прафесару належаць цікавыя разважанні пра тое, напрыклад, як у XIX ст. на тэрыторыі Віленшчыны і Гродзеншчыны фармавалася ў каталіцкім асяроддзі беларуская нацыя ва ўмовах супрацьстаяння царскаму рэжыму. Гэтай праблеме прысвечаны шэраг навуковых публікацый А.Пяткевіча, сярод якіх найбольш вылучаецца артыкул "Рэгіянальныя асаблівасці культуры Гродзеншчыны". Даследчыка хвалюе і пытанне аб асветніцкім руху на Беларусі ў XIX—XX стст., які разглядаецца ім як частка нацыянальна-вызваленчай, адраджэнцкай дзейнасці беларускай інтэлігенцыі. Ідэі эпохі Асветніцтва XVII—XVIII стст., рэалізаваныя ў заходнееўрапейскіх краінах на карысць нацыянальна-дзяржаўнага станаўлення, для Беларусі застаюцца актуальнымі і ў наш час. Пераконваемся ў гэтым, чытаючы публікацыі А.Пяткевіча "Асветніцкі кірунак творчай дзейнасці Янкі Купалы", "Асветніцкі кірунак творчай дзейнасці Сакрата Яновіча". XIX ст. асэнсоўваецца ў гэтым рэчышчы ў артыкулах вучонага "Нацыянальнае мінулае і рух асветніцкай ідэалогіі ў Беларусі ў XIX ст.", "Асветніцкая ідэя ў беларускай культуры XIX ст." Карацей кажучы, А.Пяткевіч "ломіць" традыцыйнае ўяўленне пра эпоху Асветніцтва на Беларусі і звязвае яе не толькі з XVIII ст., але і з пазнейшым часам. Нацыянальна-патрыятычныя асветніцкія ідэі, паводле слушных назіранняў даследчыка, вельмі патрэбны былі ва ўмовах і Расійскай імперыі, і савецкага таталітарызму, надзвычай патрэбны яны і цяпер. Нашы дзеячы літаратуры і мастацтва сапраўды вымушаны па-ранейшаму быць асветнікамі. Сучасны нам Уладзімір Караткевіч выконваў гэту місію, звяртаючыся ў сваіх творах да гістарычнай даўніны, Васіль Быкаў зараз часта выступае ў друку з маральна-павучальнымі прыпавесцямі, а таксама іранічна-насмешлівымі апавяданнямі, у якіх пры дапамозе гумарыстычных сродкаў паказвае нам адмоўныя рысы нашага характару.

А.М.Пяткевіч з'яўляецца аўтарам шматлікіх артыкулаў, рэцэнзій, саліднай манаграфіі пра выдатнага пісьменніка-псіхолага Кузьму Чорнага **"Сюжэт.**

*(Заканчэнне на 8-й стар.).*

# НОВОСТИ

## В НОГУ СО ВРЕМЕНЕМ

В университете введена должность проректора по учебной работе и информатизации. Это, надеемся, позволит совершенствовать организационную структуру и систему управления учреждением образования, повысить эффективность его функционирования. Предполагается, что динамично будет развиваться система информационно-аналитиче-ской поддержки принятия управленческих решений.

Новому проректору поручается осуществлять планирование, организацию и контроль процессов информатизации, автоматизации и развития электронных коммуникаций и средств связи в университете. Он будет курировать работу ВЦ, Центра электронных коммуникаций, отдела ТСО и лабораторий по профилю деятельности. Теперь, возможно, ускорится внедрение АСУ «ВУЗ», более целенаправленно будут вестись работы по внедрению современных информационных технологий. Наступило время разработки проекта комплексного развития и внедрения системы информатизации и автоматизации деятельности университета.

## ЕЩЕ ОДИН ФАКУЛЬТЕТ

На базе отделения довузовской подготовки сектора платного образования создан факультет довузовской подготовки и профессиональной ориентации молодежи. На новый факультет возлагается непростая задача: организовать и координировать профориентационную работу, проводимую университетом, вести работу по повышению общеобразовательного уровня молодежи и подготовке ее к поступлению в высшие учебные заведения. В рамках этой многогранной работы планируется издание учебно-методических материалов для абитуриентов. Конечно же, предстоит совершенствовать формы и методы работы со средними учебными заведениями нового типа.

Предполагается разместить новый факультет на арендуемой площади областного Института повышения квалификации и переподготовки руководящих работников и специалистов образования, что расположен на улице Гагарина.

# ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ УСТОЙЛІВАЕ РАЗВІЦЦЁ

## НА ПАСЯДЖЭННІ САВЕТА УНІВЕРСІТЭТА ВЫСТУПІЎ РЭКТАР УНІВЕРСІТЭТА ПРАФЕСАР С.А.МАСКЕВІЧ

Сёлетняя вясна незвычайная. Яна — першая ў новым тысячагоддзі. Значнасць гэтага моманту, а таксама важнасць пытання парадку дня абавязвае сур'ёзна і з адказнасцю азірнуцца на пройдзены шлях, задумацца аб планах і перспектывах. Безумоўна, роля навукі і адукацыі ў XXI стагоддзі ўзрастае, сказаў прафесар С.А.Маскевіч, мы — на стадыі пераходу да масавай вышэйшай адукацыі, бо навукова-тэхнічны прагрэс упэўнена ўваходзіць ва ўсе галіны вытворчасці, тычыцца ўсяго нашага жыцця.

Далей С.А.Маскевіч адзначыў адметныя вехі года мінулага. Па-першае, калектыў адзначыў 60-годдзе з дня заснавання нашай навучальнай установы. Гэты юбілей стаў і падвядзеннем вынікаў работы, і распрацоўкай перспектыўных задач. Святкаванне юбілею стала значнай падзеяй не толькі для калектыву універсітэта, але і для ўсяго гродзенскага рэгіёну. Варта таксама нагадаць, што група навукоўцаў атрымала дзяржаўныя ўзнагароды. Яшчэ адной важнай падзеяй справаздачнага перыяду можна назваць атэстацыю. Па выніках работы дзяржаўнай атэстацыйнай камісіі універсітэт адпавядае патрабаванням, якія прад"яўляюцца да вышэйшых навучальных устаноў універсітэцкага тыпу. Таксама паспяхова прайшлі комплексную праверку КРУ і Дзяржаўнага камітэта па пытаннях фінансава-гаспадарчай дзейнасці. Адкрыты яшчэ адзін факультэт — псіхалогіі.

Паспяхова праведзена кампанія па набору студэнтаў на першы курс — 2119 чалавек па 42 спецыяльнасцях сталі студэнтамі, 58 - магістрантамі, 51 - аспірантамі. У 2000 годзе, сказаў далей рэктар, з дыпломамі нашага універсітэта атрымалі пуцёўку ў жыццё 1278 спецыялістаў па 25 спецыяльнасцях, 46 магістрантаў, 33 аспіранты. Прыняты ў магістратуру 58, у аспірантуру — 51 чалавек.

Сёння калектыў універсітэта налічвае 12832 чалавекі, у тым ліку на ўсіх формах навучання — 11249 чалавек, штатных выкладчыкаў і супрацоўнікаў — 1583. Усяго ва універсітэце вядзецца падрыхтоўка і перападрыхтоўка кадраў па 44 спецыяльнасцях. Па дзесяці спецыяльнасцях на першы курс набіралі ўпершыню. Атрымала далейшае развіццё практыка сумеснай падрыхтоўкі спецыялістаў з іншымі ВНУ. Варта сказаць і аб якасці падрыхтоўкі кадраў. У 2000-м годзе выдадзена 12 працэнтаў дыпломаў з адзнакай. 17,6 працэнта — на дзённым аддзяленні.

Па выніках атэстацыі ўзровень ведаў адпавядае патрабаванням па ўсіх спецыяльнасцях, дзе ёсць выпускны курс. Разам з тым мы не можам быць задаволенымі вынікамі самаатэстацыі — 14 дысцыплін з 181 мелі сярэдні бал ніжэй «3», а на 24 колькасць нездавальняючых адзнак перавысіла 15 працэнтаў. Не можа задаволіць бягучая паспяховасць на шэразе факультэтаў і працэнт адлічэння.

Дасягнуты значныя поспехі ў навуцы і культурна-масавай рабоце, сацыяльнай сферы.

Узровень навуковых даследаванняў павысіўся. Узраслі аб"ём навуковых выданняў, аб"ём публікацый у навуковых часопісах, колькасць выдадзеных манаграфій і падручнікаў, колькасць навуковых супрацоўнікаў. Прыняты новыя навуковыя і навукова-тэхнічныя праграмы, з"явіліся новыя навуковыя лабараторыі, павялічылася колькасць навуковых публікацый студэнтаў.

**Успеваемость**

| Факультет\Год | 97/98 | 98/99 | 99/00 | 00/01 | <Усп.> | <Отчисл.> |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Психологии | 91 | 90 | 87 | 90 | 90 | 5 |
| Педагогический (ПМНО) | 92 | 90 | 91 | 83 | 89 | 5 |
| Педагогический (ОП) | 95 | 89 | 90 | 80 | 89 | 6 |
| Филологический (РГФ) | 84 | 89 | 92 | 87 | 88 | 9 |
| Биологии и экологии | 78 | 78 | 83 | 80 | 80 | 13 |
| Математический | 80 | 72 | 89 | 75 | 79 | 26 |
| Истории и культуры | 79 | 82 | 79 | 75 | 79 | 7 |
| Гуманитарный | | | 79 | 76 | 78 | 2 |
| Экономики и управления | 74 | 82 | 76 | 78 | 78 | 20 |
| Юридический | 71 | 75 | 79 | 81 | 77 | 17 |
| Филологический (БСЛ) | 78 | 76 | 71 | 75 | 75 | 15 |
| Филологический (РКФ) | 70 | 70 | 81 | 78 | 75 | 15 |
| Физико-технический | 67 | 76 | 69 | 73 | 71 | 18 |
| Физкультуры | 62 | 57 | 54 | 54 | 57 | 33 |
| В среднем по университету | 79 | 79 | 80 | 78 | | |

Павысіўся ўзровень арганізацыі і якасць культурна-масавых, фізкультурна-аздараўленчых і спартыўных мерапрыемстваў.

Удзельнічаючы ў розных конкурсах, фестывалях і спартыўных спаборніцтвах рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўняў, станавіліся лаўрэатамі і пераможцамі ансамбль "Капрыс", студэнцкі тэатр эстрадных мініяцюр "Вернісаж", тэатр моды, фальклорны ансамбль "Алёна", каманды барцоў класічнага стылю, баскетбалістаў, валейбалістаў, лёгкаатлетаў, а каманда КВЗ універсітэта выйшла ў вышэйшую рэспубліканскую лігу і дастойна выступае ў ёй.



Средняя заработная плата, <ЗП>, ППС в республике – 85,6 тыс. руб.

Значныя зрухі адбыліся ва ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы за кошт арэнды, капітальнага рамонту і рэканструкцыі.

Значная ўвага надавалася павышэнню заработнай платы, сацыяльнай падтрымцы пенсіянераў, ветэранаў, аздараўленню супрацоўнікаў, будаўніцтву жылля.

Сярэдняя заработная плата за снежань мінулага года па універсітэту склала 104,700 тыс. рублёў. У тым ліку ПВС — 143,0 тыс. пры сярэдняй па рэспубліцы - 86,7 тыс. руб.

Аклад: дэкан-асістэнт: 39,2 — 26,5 тыс.

Мін. з/п:- 29,0 — 194 тыс.

Макс. з/п - 100 — 606 тыс.

У сувязі з сацыяльна-арыентаванай палітыкай ва універсітэце колькасць дзён, калі нашы супрацоўнікі былі непрацаздольнымі, паменшылася з 9070 ў 1999 годзе да 7017 у 2000 годзе.

Кажучы пра развіццё сацыяльнай сферы ў будучыні, неабходна адзначыць, што пакуль рэалізаваны і атрыманы першыя вынікі ўведзенай у дзеянне сацыяльнай праграмы. Яны паказваюць, што яе кірункі становяцца для адміністрацыі універсітэта адным з галоўных механізмаў пераўтварэнняў. Наперадзе - больш складаная праца па яе паглыбленні.

Калектыў універсітэта плёна працуе над павелічэннем платных адукацыйных паслуг. Сёння важна, каб усе структурныя падраздзяленні імкнуліся зарабляць.

Як паведаміў прафесар С.А.Маскевіч, калектыву універсітэта трэба шукаць шляхі вырашэння вострых праблем, якія ўзнікаюць з-за некаторых знешніх фактараў. Гэта, у першую чаргу, цяжкае становішча ў эканоміцы рэспублікі, дэфіцыт фінансавых сродкаў. Трэба больш увагі надаваць інавацыйнаму шляху развіцця. Да таго ж дэмаграфічныя праблемы вымушаюць шукаць новыя шляхі прадстаўлення адукацыйных паслуг. Бо недалёка той час, калі з-за дэмаграфічнага спаду знізіцца колькасць выпускнікоў школ, гімназій, ліцэяў — будучых абітурыентаў. За іх, працэй ка-

*(Працяг на 5-й стар.).*

# ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ УСТОЙЛІВАЕ РАЗВІЦЦЁ

*(Праціяг. Пачатак на 4-й стар.).*

жучы, трэба будзе змагацца з канкурэнтамі.

Сёння мы бачым шмат праблем, і сярод іх - неабходнасць удасканалення ўсёй




сістэмы адукацыі, якасць падрыхтоўкі абітурыентаў, маральна-этычныя каштоўнасныя арыентацыі моладзі. Патрэбны новы падыход у сувязі з адкрытай інфармацыйнай прасторай, хуткім развіццём адукацыйных тэхналогій на аснове сродкаў тэлекамунікацыі. На жаль, далейшае развіццё стрымліваюць недасканаласць адукацыйных стандартаў, вострая канкурэнцыя на рынку адукацыйных паслуг, праблема кадраў у рэспубліцы і універсітэце, праблема матэрыяльна-тэхнічнай базы.

Каб забяспечыць устойлівае развіццё універсітэта як цэнтра адукацыі, навукі і культуры, сказаў далей рэктар, нашымі галоўнымі задачамі на бліжэйшую і далёкую перспектыву могуць быць: захаванне станоўчага (спецыялісты і маральна-псіхалагічны клімат у калектывах), забеспячэнне атрымання даходаў, як мінімум дастатковых для ўтрымання дасягнутага ўзроўню заработнай платы і паступовага паляпшэння матэрыяльна-тэхнічнай базы універсітэта за кошт адукацыйных паслуг, навуковай, навукова-вытворчай і інавацыйнай дзейнасці.




Апошняе магчыма толькі ў выпадку паляпшэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў




шляхам укаранення новых адукацыйных тэхналогій і даследчыцкага прынцыпу навучання, удасканалення форм зместу навучання, арыентаваных на фарміраванне творча актыўнай, з высокай самаацэнкай асобы, патрыёта сваёй рэспублікі, павышэння кваліфікацыі і якаснага складу выкладчыкаў і супрацоўнікаў, памяншэння аб'ёму вучэбнай нагрузкі, фарміраванне дзейснай сістэмы кіравання, якая забяспечыць якаснае планаванне і выкананне ўпраўленчых функцый на падставе навуковых падыходаў і асабістай зацікаўленасці кожнага ў поспехах калектыву, арыентацыі ўсіх супрацоўнікаў на канчатковы вынік, арыентацыі навуковых даследаванняў на дасягненне канкрэтных вынікаў, якія могуць быць ацэнены з пункту гледжання іх узроўню, як сусветны, або з пункту гледжання станоўчага эфекту ў практыцы навучання, або захавання нашай спадчыны, або эканамічнага эфекту (рэальных фінансаў) у вытворчасці. Тэматыка даследаванняў (у тым ліку дыпломных) павінна быць на самай справе актуальнай для жыццядзейнасці універсітэта, рэспублікі ці забяспечваць пэўны ўклад у сусветную навуку.

Базавымі фактарамі сістэмы адукацыі, як вядома, з'яўляюцца: жаданне навучэнцаў







атрымліваць веды і сацыялізавацца, у тым ліку праз набыццё сучасных прафесійных якасцей; прафесійны ўзровень

*(Заканчэнне на 6-й стар.).*



*Информирует пресс-служба научной библиотеки*

## ПРАЗДНИК КНИГИ

На кафедре польской филологии прошла презентация учебника-хрестоматии для средних школ «Historia leteratury polskej» и 5-томника материалов Международной научной конференции «Адам Міцкевіч і сусветная культура». Представляя новые книги, заведующая кафедрой польской филологии профессор С.Ф.Мусиенко подчеркнула, что эти издания - итог продолжительной и кропотливой совместной работы ученых-полонистов нашего университета и ряда ведущих вузов Республики Польша.

С выходом в свет новых изданий под редакцией профессора С.Ф.Мусиенко большой коллектив авторов-составителей поздравили ректор Академии Подлясской Антони Йовко, проректор по научной работе Академии Эдвард Павловски, проректор по научной работе ГрГУ имени Я.Купалы В.В.Сенько, декан филологического факультета В.К.Церлюкевич, студенты университета, а также многочисленные участники праздника книги.

## И СОВЕТ, И ПРЕЗЕНТАЦИЯ

На заседании библиотечного совета университета обсуждены итоги работы научной библиотеки за минувший год и определены задачи на ближайшую перспективу. Год 2000-й был поворотным в деятельности библиотеки, подчеркнул директор библиотеки Г.В.Данилов. Главный его итог - разработка и принятие Советом университета программы развития библиотеки на 2001-2005 годы. Пополнялся фонд, появилась новая коллекция электронных баз данных. Велась работа над созданием привлекательного образа библиотеки в общественном сознании.

Была проведена презентация мировых информационных ресурсов в формате CD-ROM. Заведующая информационно-библиографическим отделом Ф.С.Лельчук представила на суд членов совета и ведущих специалистов библиотеки имеющиеся в университете электронные базы данных. К ним проявляют интерес все категории читателей.

## ДОГОВОР НА ОБСЛУЖИВАНИЕ ПО МБА

По инициативе дирекции библиотеки подписан договор на обслуживание по иногороднему межбиблиотечному абонементу между Российской национальной библиотекой (РНБ) и ГрГУ имени Я.Купалы. Отныне мы можем получать из РНБ по заказам читателей библиографическую информацию, документы во временное пользование в виде оригиналов или копий. Возможно также получение библиотекой копий документов (ксерокопий) в постоянное пользование.

Таким образом, продолжается создание единого информационного пространства, разрушенного в постсоветское время. Напомним, что подобные договоры мы уже имеем с ВИНИТИ и ИНИОН (Россия).

## СОЗДАЕТСЯ WEB-САЙТ

В соответствии с программой развития библиотеки начата работа по созданию официального Web-сайта библиотеки. Уже разработаны функциональная схема сайта, структуры баз данных, CGI-скриптов. Дизайн сайта смогут оценить пользователи после его установки на сервер университета. Создание прототипа сайта и его тестирование задерживается из-за отсутствия финансирования, хотя этот проект, имеющий исключительно важное значение для университета, был заявлен в Программе развития библиотеки, принятой Советом университета.

## ВЫСТАВКА НОВЫХ ЖУРНАЛОВ

В читальном зале главного учебного корпуса развернута выставка новых периодических изданий. Здесь вы найдете журналы по информационным технологиям, педагогике, психологии, предпринимательству.

Одновременно в информационно-библиографическом отделе открыта книжная выставка «Наука Гродненщины», которая приурочена к 61-й годовщине со дня основания вуза.

**В.ГЕЦОЛД,**
**зам. директора научной библиотеки.**

# ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ УСТОЙЛІВАЕ РАЗВІЦЦЁ

*(Заканчэнне. Пачатак на 5-й стар.).*

ведаў і навуковая кампетэнтнасць выкладчыкаў, якія ажыццяўляюць адукацыйны працэс; якасць навучальных планаў і праграм, падручнікаў і навучальных дапаможнікаў, навучальна-лабараторнага абсталявання і тэхнічных сродкаў навучання.

Узнікла пытанне аб новым якасным узроўні адукацыі, здольным забяспечыць нарошчванне навукова-тэхнічнага патэнцыялу грамадства, фармаванне адэкватнай кадравай структуры для развіцця эканомікі і сферы паслуг, павышэнне прафесійнай канкурэнтаздольнасці выпускнікоў ВНУ на сучасным рынку працы.

Трэба стварыць такое навучальнае асяроддзе, якое, ужо ў межах навучання ў ВНУ, дазволіць студэнту авалодаць навыкамі самастойнай працы, выпрацаваць здольнасць арыентавацца ў інфармацыі, якая пастаянна абнаўляецца, з тым, каб на працягу ўсяго наступнага жыцця можна было пастаянна выкарыстоўваць любыя магчымасці для абнаўлення, паглыблення і ўзбагачэння першапачаткова атрыманых ведаў, дзейнічаючы ў адпаведнасці з узнікаючымі патрэбнасцямі.

Праца калектыву аналітыкаў з Украіны па тэме “Актывізацыя пазнавальнай дзейнасці студэнтаў у рамках аўдыторных заняткаў” дазволіла зрабіць некаторыя высновы, з якімі нельга не пагадзіцца.

1. Пры ўсіх цяжкасцях і складанасцях, якія суправаджаюць сённяшнюю вышэйшую адукацыю, магчымасці трансфармацыі арганізацыі навучальнага працэсу ў бок яго набліжэння да сучасных патрабаванняў відавочныя.

2. Стратэгічную задачу, звязаную з пераносам цэнтра цяжару ў навучальным працэсе з абавязковых аўдыторных заняткаў на самастойныя, неабходна “драбіць” на рэальна дасягальныя тактычныя мэты, дынамічна рухаючыся наперад у гэтым кірунку.

3. Апорнае выкладанне як безумоўны кампанент фармавання пазнавальнай актыўнасці студэнтаў найбольш эфектыўнае толькі на старэйшых курсах і пры сістэматычным выкарыстанні.

4. Курс на актывізацыю пазнавальнай дзейнасці студэнтаў мае на мэце рэзкае і істотнае паляпшэнне метадычнага забеспячэння навучальнага працэсу (пры пастаянным яго ўдасканаленні) і максімальны доступ да выкарыстання новых інфармацыйных тэхналогій.

5. Пераарыентацыя навучальна-выхаваўчага працэсу на актывізацыю пазнавальнай дзейнасці студэнтаў, рост іх самастойнасці, скарачэнне традыцыйных аўдыторных і выкарыстанне навацыйных формаў працы вядзе да адчувальнага сутнаснага (і кольснага) росту выкладчыцкай нагрузкі, што неабходна ўлічваць, робячы адпаведныя карэктывы і ў яе нармаванне.

6. Арыентацыя на сучасныя метады выкладання патрабуе кардынальных зменаў усіх ключавых складнікаў навучальна-выхаваўчага працэсу (выкладчыцкага корпуса, студэнцкага кантынгенту, матэрыяльна-тэхнічнага і метадычнага забеспячэння).

“Універсітэт ёсць выкладанне праз даследаванне, якое праводзіцца на вачах навучэнцаў... Адзінства даследавання і выкладання азначае, перш за ўсё, што навуку ва універсітэцкім выкладанні разглядаюць заўсёды як яшчэ не зусім вырашаную праблему, як нешта, што знаходзіцца ў працэсе даследавання, тады як школа вучыць гатовымі і завершанымі пазнаннямі”

(С.І. Гесэн).

Даклад прафесара С.А.Маскевіча выклікаў жывую зацікаўленасць у членаў Савета універсітэта. У абмеркаванні даклада - галоўнага выніковага дакумента года мінулага - прынялі актыўны ўдзел многія члены Савета. Выступілі дырэктар Інстытута паслядыпломнай адукацыі пры Установе адукацыі ГрДУ імя Я. Купалы Ю.Ю.Гняздоўскі, дэкан факультэта эканомікі і кіравання Ю.Э.Бялых, прарэктар па АГР М.Ф.Кантаровіч і іншыя. Было ўнесена шмат прапаноў.

# СПОРТИВНЫЙ КАЛЕЙДОСКОП

**РУБРИКУ ВЕДЕТ СТАРШИЙ ПРЕПОДАВАТЕЛЬ КАФЕДРЫ ФИЗВОСПИТАНИЯ О.СМОЛЯКОВ**

## ТРЕТИЙ ГОД - ПЕРВЫЕ

В соревнованиях по борьбе дзюдо среди женских команд в программе республиканских студенческих спортивных игр принимали участие спортсменки из двадцати одного вуза страны.

Три золотые, одна серебряная и две бронзовые медали и первое общекомандное место - таков итог выступления женской команды нашего университета. Кстати, такого успеха команда добивается третий год подряд.

На высшую ступень пьедестала поднялись Татьяна Пастарнакевич (вес 48 кг), Елена Бабак (вес 70 кг), Янина Скворцова (вес 78 кг), на вторую ступень - еще раз Елена Бабак (абсолютная весовая категория), на третью - Елена Козич (вес 52 кг) и Виктория Омелящик (вес 57 кг).

Подводя итоги выступления девушек, тренер команды кандидат медицинских наук, доцент кафедры спортивной медицины и ЛФК Александр Бардин сказал:

- Борьба была очень упорной. После первого дня соревнований мы были на седьмом месте. Все решил второй день. Об этом знали и представители других вузов.

Неудача первого дня нашей команды заключалась в том, что «провал» получился у лидера команды, чемпионки страны Валентины Разуменко, которая не восстановилась после длительного спортивного марафона (две золотые медали чемпионата Европы и мира), а также травмы сказались на ее выступлении. Роль лидера в этом весе (70 кг) взяла на себя ее подруга по команде Е.Бабак, которая стала чемпионкой.

Тем не менее, учитывая представительство этих соревнований (участвовали все сильнейшие спортсмены РБ). Все знали, что вопрос распределения мест в личном и командном первенствах решит последний день соревнований.

Здесь на себя взяли основную нагрузку студентки I курса Т.Пастарнакевич и Е.Козич.

Надо отдать должное девушкам. Несмотря на предвзятость судейства, они «вырвали» победу.

В связи с многократными успешными выступлениями сборной команды состоялась встреча ректора университета профессора С.А.Маскевича с командой, ее тренером и деканом факультета А.И.Навойчика. Обсуждены проблемы команды. Для нее будет приобретена новая спортивная форма, будет оказана помощь в подготовке к чемпионату Европы в Болгарии.

## БОРЦЫ НА ПЬЕДЕСТАЛЕ

Минск стал местом проведения открытого чемпионата страны по борьбе самбо на призы Президента Республики Беларусь. В составе сборной команды Гродненской области был студент 3 курса факультета физической культуры нашего университета Вадим Уколов, выступавший в весовой категории свыше 100 кг (тренер И.Шарко). В соревнованиях принимали участие спортсмены Японии, Италии, Испании, России, Украины, Казахстана, Узбекистана, Литвы и сборные команды областей Беларуси.

Вадим провел три встречи, две выиграл, одну проиграл минчанину, чемпиону мира Леониду Свириду, и поднялся на третью ступень пьедестала.

Около тридцати команд принимали участие в соревнованиях по борьбе дзюдо среди мужских команд. Три медали на счету нашей команды (тренер И.Шарко).

Две медали - у Вадима Уколова (вес - 100 кг). «Серебро» у него в тяжелой весовой категории, а «бронза» - в абсолютной весовой категории. Серебряным призером стал Дмитрий Новик (вес 60 кг), уступивший в финале заслуженному мастеру спорта, минчанину Н.Багирову.

## ИЗ УЗБЕКИСТАНА - С НАГРАДАМИ

С 1997 года в Ташкенте проводится турнир по вольной и греко-римской борьбе «Кубок независимости» категории «Гран-при».

И в этом году турнир собрал спортсменов из 15 стран, в том числе Индии, России, Кореи, Украины, Японии.

Среди почетных гостей - трехкратные олимпийские чемпионы Александр Медведь и Александр Карелин, вице-президент ФИЛА Рафи Мартинетти.

В весе до 58 кг студент 3 курса факультета физической культуры нашего университета Александр Карницкий, недавно победивший на турнире А.В. Медведя в Минске, провел в предварительном турнире все схватки без поражения. В решающем поединке встретился с хозяином ковра Д.Захардиновым, которого победил в Минске. А в этой встрече Александр с минимальным разрывом в очках уступил узбеку и завоевал почетное второе место.

Наш выпускник Александр Сидоренко (вес 97 кг) (греко-римская борьба) - (тренер В.Максимович), стал третьим призером престижного турнира.

## ГАНДБОЛИСТЫ - В ФИНАЛЕ

В Минске прошли зональные соревнования по гандболу среди мужских команд в программе республиканских студенческих игр.

Шесть команд боролись за три путевки в финал, в том числе и сборная команда нашего университета (тренер Калита Д.В.).

Наши ребята, победив в двух встречах, заняли третье место и попали в финальную стадию соревнований.

Женская сборная команда (тренер М.Ф.Бура), призер прошлогодней спартакиады, допущена в финал без предварительных игр.

Итак, в финале, который пройдет в мае, примут участие две наши команды.

Хочется надеяться, что они займут достойные места.

## СОРЕВНУЮТСЯ ПРЕПОДАВАТЕЛИ

Стартовала спартакиада «Здоровье» среди преподавателей и сотрудников университета. Игровой зал по ул.Захарова-32 собрал любителей игры в мини-футбол. В соревнованиях приняли участие шесть сборных команд - физико-технического факультета, факультета ЭиУ, ФФК, юридического факультета, Института последипломного образования и сборная команда преподавателей общежития № 1.

В результате пятидневной и достаточно упорной борьбы сборная команда общежития № 1, проиграв только физикам и победив все остальные команды, вышла с 12 очками на первое место. В составе команды играли С.М.Токть, В.Р.Климук, М.А.Белокоз, О.З.Ольшевский, Г.М.Мохань, Э.В.Мазько, А.С.Марчук. Сердечно поздравляем с заслуженной победой и желаем дальнейших успехов. С такой же суммой набранных очков на вторую ступеньку пьедестала вышла сборная команда юристов, проиграв только чемпионам. На третьем месте - команда факультета физической культуры - 9 очков в трех победах. Далее команды распределились следующим образом: Институт последипломного образования - на 4 месте, физики - пятые, команда факультета ЭиУ - на 6 месте. Победители и призеры награждены призами профсоюзного комитета и грамотами спортклуба.

Приятно отметить, что за команду Института последипломного образования выступал и руководитель Института Юрий Гнездовский.

Спартакиада продолжается в марте, покажут свое мастерство любители шахмат. В апреле пройдут соревнования по волейболу и баскетболу. Приглашаем всех желающих в спортивный зал главного корпуса.

**А.ЕМЕЛЬЯНЕНКО,**
**директор спортклуба.**

## В СОВЕТАХ ПО ЗАЩИТЕ ДИССЕРТАЦИЙ

2 февраля 2001 года советом К 02.14.02 при ГрГУ им. Я.Купалы (председатель совета профессор И.П.Мартынов, ученый секретарь совета доцент В.А.Пронько) присуждена ученая степень кандидата физико-математических наук по специальности 01.01.02 - дифференциальные уравнения - Виктору Михайловичу Пецевичу (научный руководитель профессор И.П.Мартынов).

2 марта 2001 года советом К 02.14.01 при ГрГУ им. Я.Купалы (председатель совета профессор Н.В.Сильченко, ученый секретарь совета доцент О.Н.Толочко) присуждена ученая степень кандидата юридических наук по специальности 12.00.01 - теория и история права и государства; история правовых учений - Сергею Александровичу Жевнеровичу (научный руководитель профессор Н.В.Сильченко) и Наталье Францевне Ковкель (научный руководитель профессор Н.В.Сильченко).

**Н.НЕЧУХРИНА,**
**методист высшей категории отдела маркетинга и права.**

## ПАДРЫХТОЎКА НАВУКОВЫХ КАДРАЎ

У 2000 годзе і за два месяцы гэтага года 19 чалавек абаранілі кандыдацкія дысертацыі, з іх 3 - датэрмінова. Доктарскія дысертацыі абаранілі Святлана Яўгенаўна Куль-Сяльверстава і Славамір Сцяпанавіч Ануфрык.

## СХОД ВЕТЭРАНАЎ

Прайшоў справаздачны сход членаў ветэранскай арганізацыі. З інфармацыяй аб рабоце Савета ветэранаў выступіў яго старшыня М.В.Васілючак. Ён расказаў аб найбольш значных ступенях работы, адзначыў і недахопы. У абмеркаванні прынялі ўдзел першы прарэктар па выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях І.П. Мартынаў, старшыня прафкома супрацоўнікаў Ул.А.Хілюта, старшыня ветэранскай арганізацыі г.Гродна І.І.Абросімаў, члены ветэранскай арганізацыі.

Быў абраны новы склад Савета ветэранаў у колькасці 11 чалавек. Старшыня - М.В.Васілючак, намеснікамі абраны Г.Ф.Курышка, К.У.Крыжаноўскі, сакратаром - Л.М. Хутарская. Члены Савета -І.П.Мартынаў, М.К.Левандоўскі, М.А. Зянькова, К.А.Мандрык, В.С.Лішчук.

**М.ВАСІЛЮЧАК,**
**старшыня Савета ветэранаў.**

## ЛЕПШЫ ПАКАЗЧЫК

Вялікая ўвага ва універсітэце надаецца аздараўленню ПВС, супрацоўнікаў і студэнтаў. Акрамя пуцёвак, якія атрыманы ў планавым парадку з гарадскога цэнтра на аздараўленне, адміністрацыя універсітэта ў апошні час у адпаведнасці з калектыўным дагаворам рэгулярна ажыццяўляе адлічэнне грашовых сродкаў прафкому супрацоўнікаў на аздараўленне работнікаў універсітэта і іх дзяцей. Так, у мінулым годзе з гэтай мэтай было выдзелена 2,5 млн. рублёў, што дазволіла дадаткова закупіць 55 пуцёвак для дарослых і 47 - для дзяцей. Гэта - лепшы паказчык за ўсе гады існавання універсітэта.

**Ул.ХІЛЮТА,**
**старшыня прафкома супрацоўнікаў.**

## Аляксею Міхайлавічу ПЯТКЕВІЧУ - 70 гадоў

## СЛОВА ПРА НАСТАЎНІКА

*(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.).*

**Кампазіцыя. Характар**" (Мн., 1981), аўтарам ужо згаданай намі "**Літаратурнай Гродзеншчыны**", у анатацыі да якой сказана, што даследчык "напісаў надзвычай багатую на факты і імёны кнігу пра літаратараў Прынёманскага краю, якія яшчэ са старажытных часоў пакідалі прыкметны след у шматнацыянальнай культуры Беларусі, цікава сцвярджаюць сябе ў творчасці і ў наш час". У гэтай кнізе, дарэчы, даюцца звесткі не толькі пра пісьменнікаў літаратуразнаўцаў, а і пра этнографаў, фалькларыстаў, мастацтвазнаўцаў, краязнаўцаў, літаратурнае жыццё паказваецца ў адпаведным культуралагічным кантэксце. Выданне карыснае і сваімі фотаздымкамі, многія з якіх з асабістага архіва А.Пяткевіча і трапілі ў друк упершыню.

Самая ж новая кніга прафесара — даведнік "**Людзі культуры з Гродзеншчыны**" (Гродна, 2000). У ім каля 800 персаналій...

Адзначым, што, куды б ні рыхтаваў свой матэрыял Аляксей Пяткевіч (для ўласнай манаграфіі, у рэспубліканскі ці замежны часопіс, на рэгіянальную канферэнцыю ці ў абласную газету), ён заўсёды выконвае яго на высокім прафесійным узроўні. У любой яго працы, малой ці вялікай, навуковыя аргументы вынашаныя, выверaныя, кожнае слова — на сваім месцы, фраза — адшліфаваная. Нагадаем, што яшчэ ў 1971 г. за значны ўклад у развіццё літаратурнай крытыкі А.Пяткевіч быў прыняты ў Саюз беларускіх пісьменнікаў. Хочацца спадзявацца, што ў хуткім часе ўся навуковая спадчына гэтага чалавека будзе выдадзена ў выглядзе шматтомнага збору твораў.

Ёсць у Аляксея Міхайлавіча і свая школа: каторы ўжо год ён рыхтуе аспірантаў па спецыяльнасці "Гістарычная культуралогія". Да сваіх мудрых назіранняў над беларускай літаратурай і культурай прафесар А.М. Пяткевіч актыўна далучае і студэнтаў Гродзенскага універсітэта, чытаючы ім курс "Гісторыя айчыннай культуры", спецкурсы "Людзі культуры Беларусі першай паловы XX ст.", "Гісторыя тэатра і кіно на Беларусі", "Літаратура Гродзеншчыны", кіруючы шматлікімі курсавымі і дыпломнымі работамі. Раней, працуючы на кафедры літаратуры, Аляксей Міхайлавіч чытаў беларускі фальклор, гісторыю беларускай літаратуры, уводзіны ў літаратуразнаўства, тэорыю літаратуры. З маладых гадоў ён чытае лекцыі "без паперкі", даводзіць да слухачоў свае думкі паслядоўна, лагічна і пераканаўча. У яго добра пастаўлена дыкцыя, выдатна развіта красамоўства. Да таго ж Аляксей Міхайлавіч заўсёды падцягнуты, энергічны, з густам апрануты. Як чалавек перадавых поглядаў, высокай культуры і высокіх маральных якасцяў ён выбіраўся мясцовым насельніцтвам у Гродзенскі гарадскі і абласны Саветы народных дэпутатаў.

Аляксей Пяткевіч, які прыкмеціў асветніцкую тэндэнцыю ў айчыннай культуры XIX—XX стст., і сам паўстае перад намі як сапраўдны асветнік, актыўны папулярызатар ведаў пра Беларусь. Ён неаднаразова выступаў з лекцыямі перад школьнікамі, настаўнікамі, іншай грамадскасцю, звяртаючы ўвагу на прыгожае ў нацыянальным жыцці, у нашай літаратуры і мастацтве, заклікаючы берагчы і памнажаць агульначалавечыя каштоўнасці. Яшчэ ў застойны перыяд вядучы на абласной студыі тэлебачання перадачу "Кнігарня", ён з вялікім захапленнем расказваў людзям пра новыя кнігі. Зараз у "Гродзенскай праўдзе" на кожны новы год друкуе для масавага чытача каляндар памятных датаў культуры Гродзеншчыны, з'яўляецца Старшынёй Гродзенскай гарадской Рады Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны.

30 сакавіка 2001 г. прафесару Аляксею Міхайлавічу Пяткевічу споўнілася семдзесят гадоў з дня нараджэння. Хочацца пажадаць яму моцнага здароўя, новых поспехаў у навукова-педагагічнай дзейнасці, шчасця ў асабістым жыцці.

**М.ПАЖАРЫЦКІ,**
**старшы выкладчык кафедры беларускай культуры**

*Рэдактар* **Людміла Мікалаеўна ДАНІЛАВА**

*Заснавальнік: Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы.*
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 519.

Газета набрана, звярстана і надрукавана на тэхніцы Установы адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы».
ЛП № 111 ад 29.12.97 г.
Вул. Ажэшкі, 22, 230023, г. Гродна.

*Набор і вёрстка:* **М. ВЕРСТАК, В. КАРАСІК.**
*Карэктура:* **Н. ДУДКО.**

*Здадзена ў набор 20.03.2001*
*Падпісана да друку: 02.04.2001 15.00*
*Заказ № 68*
Аб'ём - 1 ум. друк. арк.
Наклад 500 асобнікаў.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытатаў, эканамічных даных, асабістых імёнаў, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

*Наш адрас: 230023, г.Гродна, вул. Ажэшкі, 22, пакой 228. ☎ 72-08-17.*